## ХРОНІКА КАМСАМОЛЬСКАГА ЖЫЦЦЯ

У гэтыя дні шумна ў камітэтах камсамола факультэтаў. Рыхтуюцца справаздачна - выбарныя сходы. Яны прайшлі ўжо на гістарычным, геаграфічным, хімічным, філалагічным факультэтах, факультэце прыкладной матэматыкі і іншых.

### ГЕАФАК

Сход прайшоў вельмі актыўна і цікава. Зараз новы састаў камітэта камсамола на чале з сакратаром Сяргеем Субоцінным працуе над планам работы на бягучы навучальны год.

### ХІМФАК

Сакратаром камітэта камсамола выбран студэнт III курса Алег Івашкевіч.

### ФПМ

Тут праходзіла справаздачна - выбарная канферэнцыя. На жаль, арганізавана яна была дрэнна. Прычына? Не праявілі зацікаўленасці партыйная арганізацыя і адміністрацыя факультэта. Не было патрэбнай ініцыятывы і з боку камітэта камсамола. Хочацца верыць, што новы састаў камітэта камсамола на чале з сакратаром кандыдатам фізіка - матэматычных навук Б. Каліціным будзе працаваць у цеснай садружнасці з партыйнай арганізацыяй.

**Прэс-цэнтр камітэта камсамола.**





Лекцыю па гісторыі марксісцка-ленінскай філасофіі чытае студэнтам VI курса вячэрняга аддзялення філасофіі гістфака дацэнт С. А. Малевіч.

**Фота Д. ЧАХОВІЧА.**

# ЗА ПАРАДАЙ І ДАПАМОГАЙ

ГЭТЫМ летам кабінет методыкі і педпрактыкі філалагічнага **факультэта** атрымаў новае памяшканне. К пачатку навучальнага года было завершана яго абсталяванне, і ў кастрычніку ён прыняў першых наведвальнікаў.

...Гэты кабінет самы малады на філфаку — яму пайшоў толькі трэці год. Аднак і ў стадыі станаўлення ён быў добрым памочнікам выкладчыкаў у падрыхтоўцы студэнтаў старэйшых курсаў, будучых педагогаў да самастойнай практычнай дзейнасці.

Кабінет не проста памяняў цеснаватае старое памяшканне на новае, больш прасторнае і светлае, але і нешта набыў. Папоўніўся запас метадычнай і вучэбнай літаратуры. Галоўная ж навінка— абсталяванне лінгафоннай устаноўкі. Два магнітафоны, прайгравальнік устаноўлены на пульце ў выкладчыка. Студэнты па выбару могуць слухаць адну з дзвюх праграм, якія ідуць адначасова. Для гэтага на кожнай парце замацаваны кропкі для навушнікаў.

— У сучаснай школе шырока выкарыстоўваюцца тэхнічныя сродкі, — гаворыць Алена Андрэеўна Скачко, выкладчык методыкі выкладання беларускай мовы, адказная за кіраўніцтва педагагічнай практыкай беларускага аддзялення філфака. — Нават для нас, гуманітарыяў, тут ёсць вялікія магчымасці: паказ кіна- і дыяфільмаў, праслухоўванне твораў класікаў нашых літаратур у выкананні добрых дэкламатараў і шмат іншага. Таму ўжо цяпер мы павінны развіваць у студэнтаў жаданне працаваць з падручным матэрыялам, павінны навучыць выкарыстоўваць яго.

Цяпер заняткі з лінгафоннай устаноўкай дадуць магчымасць студэнтам быць не толькі пасіўнымі слухачамі. Яны змогуць запісаць свой голас, праверыць правільнасць вымаўлення, інтанацый, знайсці свае памылкі самастойна і выправіць іх.

У планах па методыцы выкладання беларускай і рускай мовы і літаратуры рабоце з лінгафоннай устаноўкай адводзіцца шмат часу.

Кабінет толькі становіцца на ногі і не заўсёды яшчэ поўнасцю задавальняе патрабаванні студэнтаў. Не зацягнуць гэты перыяд — вось што хвалюе цяпер выкладчыкаў методыкі.

— Нам цяпер неабходна большая колькасць школьных падручнікаў для чацвёртых — сёмых класаў, новыя выданні альбомаў Янкі Купалы і Якуба Коласа, — сказаў дацэнт Л. А. Царанкоў. — Хацелася б набыць «Фанатэку па беларускай літаратуры», якая выдадзена навукова-даследчым інстытутам педагогікі пры Міністэрстве асветы БССР. У ёй сабраны творы класікаў нашай літаратуры ў выкананні лепшых дэкламатараў.

...Пасля кожнай практыкі на філфаку з'яўляюцца плакаты, мантажы, альбомы, зробленыя студэнтамі разам з вучнямі. Раней былі цяжкасці з іх захаваннем — цяпер гэтае пытанне вырашана, і пры падрыхтоўцы да школьнага урока практыкант заўсёды зможа знайсці і неабходны ўзор канспекта, і плакаты, і дыяфільм або альбом рэпрадукцый.

Стала традыцыяй пасля кожнай педагагічнай практыкі праводзіць студэнцкую канферэнцыю па пэўнай тэме. Тэма цяперашняй — «Роля літаратуры ў фарміраванні камуністычнага светапогляду ў навучэнцаў».

...Сярэдзіна кастрычніка — пачатак практычных заняткаў. Ідуць яны і ў гэтым кабінеце. А пяцікурснікі, якія вярнуліся з уборкі бульбы, прыходзяць сюды за парадай, скласці правільна план урока, атрымаць дапаможнікі.

**С. СВЕРКУНОЎ.**





Члены кафедр вышэйшай матэматыкі і вышэйшай матэматыкі і матэматычнай фізікі абмяркоўваюць на сумесным семінары сучасныя праблемы методыкі матэматыкі.

Фота Д. Чаховіча.

# ФОРМУЛА ПОСПЕХУ

**Першакурснікі не раз выказвалі пажаданне пачуць голас студэнтаў старэйшых курсаў, атрымаць ад іх карысныя парады.**

**Сёння мы прапануем вашай увазе, дарагія сябры, выступленне студэнта V курса фізічнага факультэта, Ленінскага стыпендыята Сяргея Кіліна.**

Пяць гадоў вучобы ва універсітэце — гэта вельмі многа і ў той жа час вельмі мала. Ад таго, як яны пройдуць: насычана, у пастаянным абагачэнні ведамі, або праляцяць, як сумнае адседжванне заняткаў, «спіхванне» экзаменаў, залежыць лёс кожнага студэнта — ці будзе ён пасля заканчэння універсітэта жыць ярка і захоплена або яго чакае сумная, не зразумелая яму праца.

Чалавек паступіў ва універсітэт, ён хоча авалодаць той галіной ведаў, у якой, як яму здаецца, ён зможа быць карысным. Але тут перад ім узнікае маса ўяўных і сапраўдных цяжкасцей, асноўная з якіх, на маю думку,—разыходжанне паміж жаданнямі і практычным здзяйсненнем гэтых жаданняў. Цяпер я паўтару некаторыя парады. Яны ўсім вельмі добра вядомы, аднак мала хто да іх своечасова прыслухоўваецца. Па асабістаму вопыту магу сказаць, што рана або позна усведамляеш гэтыя парады і пачынаеш іх выконваць.

Па-першае, неабходна навучыцца цаніць час і перш за ўсё на лекцыях і практычных занятках.

Многія думаюць, што, не канспектуючы лекцый, яны потым самастойна разбяруць гэты курс. Так, гэта можна зрабіць, але прыйдзецца затраціць у дзесяць разоў больш намаганняў і часу, чым праслухаўшы курс. На лекцыі, як і пры чытанні кніг, трэба адносіцца да выкладаемага матэрыялу крытычна, старацца не проста перапісваць з дошкі, а зразумець логіку курса. Вельмі многа дае лекцыя, калі ты ўжо што-небудзь ведаеш, таму трэба старацца крыху «забегчы наперад».

Па-другое, не трэба саромецца сваіх выкладчыкаў. Задавайце больш пытанняў, размаўляйце, спрачайцеся. Сустрэчы з людзьмі, для якіх навука не проста фраза, а частка жыцця, вельмі важны для студэнта. Часам размова з такім чалавекам дасць больш, чым прачытаны падручнік. І ўвогуле, веды, атрыманыя ў гутарцы, спрэчцы, вельмі трывалыя.

Па-трэцяе, не трэба думаць, што студэнт павінен толькі накопліваць веды, — чым раней пачнеш прымяняць іх на практыцы, тым лепш. Калі ўдзельнічаеш у навуковай рабоце з першых курсаў—прывучаеш сябе думаць лагічна і зусім па-іншаму адносішся да фактычнага матэрыялу, які ў вялікай колькасці абрушваецца на студэнтаў.

Такім чынам, можна сказаць, што формула поспеху — гэта праца, праца натхнёная, упартая, штодзённая плюс паўнацэнны адпачынак— спорт, тэатр, музыка.

**С. КІЛІН.**

# ВЕДЫ, НЕАБХОДНЫЯ ЎСІМ

## ПАРАДЫ ВЫКЛАДЧЫКА ВЫВУЧАЮЧЫМ ПАЛІТЭКАНОМІЮ

Адна з важнейшых задач студэнта вну—глыбокае засваенне марксісцка-ленінскай эканамічнай тэорыі. І гэта невыпадкова. На сучасным этапе камуністычнага будаўніцтва з яго высокімі тэмпамі навукова-тэхнічнага прагрэсу, якаснымі змяненнямі ў эканоміцы вытворчасці і характары працы, як аб гэтым сказана ў рэзалюцыі XXIV з'езда КПСС па Справаздачнаму дакладу ЦК КПСС, першаступеннае значэнне набывае эканамічная адукацыя ўсіх кадраў.

Без ведання эканамічнай тэорыі нельга паспяхова рашаць задачы камуністычнага будаўніцтва. «Памылкова думаць, быццам з эканамічнымі законамі маюць справу толькі вялікія вучоныя і кіраўнікі, — гаварыў Л. І. Брэжнеў. — Гэтыя законы, калі іх зразумець правільна, дыктуюць логіку паводзін не толькі адміністратару, інжынеру, вучонаму, тэхніку, але і кожнаму радавому рабочаму, калгасніку».

Улічваючы няўхільна ўзрастаючыя патрабаванні да эканамічнай адукацыі шырокіх мас працоўных, важна адразу настроіць сябе на глыбокае, творчае і ўсебаковае авалоданне марксісцка-ленінскай эканамічнай тэорыяй і яе гранітным фундаментам — палітэканоміяй. Веды па палітэканоміі— аснова, неад'емная састаўная частка ведаў спецыяліста любога профілю. Глыбокае вывучэнне палітычнай эканоміі, як і іншых грамадскіх дысцыплін, дае студэнтам камуністычны светапогляд, партыйную перакананасць, выпрацоўвае ў іх палітычны імунітэт да рознага роду буржуазных і іншых антыкамуністычных выдумак.

Ва універсітэце палітэканомію студэнты вывучаюць на большасці факультэтаў на працягу двух семестраў, на юрыдычным факультэце і аддзяленні філасофіі гістарычнага факультэта—на працягу двух вучэбных год, або чатырох семестраў, а на аддзяленні палітэканоміі—на працягу трох год. Спачатку вывучаецца палітэканомія капіталізму, а потым—сацыялізму.

Прыступаючы да вывучэння марксісцка-ленінскай палітэканоміі, неабходна спачатку дакладна і ясна вызначыць яе прадмет, або аб'ект пазнання. Для гэтага вельмі важна цвёрда ўсвядоміць, што палітэканомія— гэта навука аб грамадскавытворчых, г. зн. эканамічных адносінах, якія аб'ектыўна ўзнікаюць паміж людзьмі ў працэсе вытворчасці, размеркавання, абмену і спажывання матэрыяльных каштоўнасцей на розных ступенях развіцця грамадства. Неабходна таксама запомніць, што вытворчыя адносіны заўсёды падпарадкоўваюцца пэўным эканамічным законам. Раскрыццё і пазнанне гэтых законаў, іх свядомае і ўмелае выкарыстанне ў практычнай дзейнасці працоўных у народнай гаспадарцы і складае асноўную задачу палітэканоміі.

Методыка вывучэння палітэканоміі абумоўлена спецыфікай яе прадмета. Звяртаючы на гэта ўвагу, К. Маркс падкрэсліваў, што пры аналізе эканамічных форм нельга карыстацца ні мікраскопам, ні хімічнымі рэактывамі. Тое і другое павінна замяніць сіла абстракцыі.

Абстрактнае мысленне — гэта вышэйшая ступень працэсу пазнання. У. І. Ленін указваў, што абстракцыя **матэрыі, закона** прыроды, абстракцыя **вартасці** і г. д., адным словам, **усе** навуковыя (правільныя, сур'ёзныя, не бяссэнсавыя) абстракцыі адлюстроўваюць прыроду глыбей, дакладней, **паўней.** Такім чынам, для глыбокага пазнання эканамічных законаў патрэбна кіравацца не ўсякімі, а толькі навуковымі абстракцыямі, якія правільна адлюстроўваюць з'явы эканамічнага жыцця, навакольнай рэчаіснасці, практыкі камуністычнага будаўніцтва. Для гэтага вельмі важна, каб той, хто вывучае палітэканомію, не толькі умеў аналізаваць канкрэтныя факты вытворчай дзейнасці людзей, але і абавязкова прымаў актыўны ўдзел у грамадскім жыцці.

Формы і метады (спосабы) вывучэння палітэканоміі разнастайныя. Гэта лекцыі і

## ТРЭЦІ ПРАЦОЎНЫ — ТРЭЦЯМУ, РАШАЮЧАМУ

# ЗАПАЛІ АГОНЬ ДУШЫ

(Заканчэнне. Пачатак у № 27).

### ПРАЗ МЕСЯЦ

12 жніўня. Дзень будаўніка. Сёння байцы будаўнічых атрадаў раёна і жыхары горада сабраліся, каб падвесці вынікі нашай месячнай працы, аддаць даніну павагі ганаровай прафесіі — будаўніка. Шумна на лясной паляне паблізу горада. Чуецца руская, беларуская, казахская мова. Узнят сцяг. Галасы змаўкаюць. Гучаць словы віншавання, падзякі.

— Першае месца прысуджаецца атраду... Не, не нам. Крыўдна? Вельмі! Здаецца, атрад рабіў усё магчымае, каб штодзень выконваць як мага больш, але працаваў не ў поўную сілу. У чым жа справа? Старая песня. Кіраўнікі ПМК усё суцяшаюць абяцаннямі, а будматэрыялы паступаюць гэтак жа дрэнна. Хлопцы хвалююцца: «Давайце работу!» І даюць. Усялякую. А што такая работа можа быць выканана ў любую пару года намаганнямі самой арганізацыі і што асноўная работа стаіць на месцы — гэтага не бачаць ні кіраўнікі ПМК, ні раённы штаб. А чаму б не накіраваць атрад на аб'ект іншай арганізацыі, балазе заяў у абласным штабе шмат.

— Хопіць вам разважаць, — спыняе ўсхваляваных хлопцаў камісар. — Зараз узнагароджанне пачнецца.

— За сумленную працу і вялікія поспехі ўзнагароджваецца...

Адзін за адным выходзяць хлопцы, а мы хвалюемся: няўжо з нашага атрада нікога?..

— ...узнагароджваю ц ц а Мікалай Мароз, Міхаіл Сахно, Мікалай Шчэрба, Аляксей Прыстрэм, Анатоль Ждановіч...

— Ура! — крычыць Славік Рубцоў.—Ведай нашых!

— ...узнагароджвае ц ц а Ала Селіванава, Надзя Алёшына...

— Бач ты, а мы дзяўчат не хацелі браць у атрад, — смяецца камандзір.

* * *

Урачыстая частка свята закончылася. Хлопцы параходзіліся: адны накіраваліся паглядзець на спартыўныя гульні, іншыя (што ні кажы — юрысты!) прызваны сёння глядзець за парадкам, а трэціх зацікавіла імправізаваная сцэна, адкуль чуліся знаёмыя гукі беларускай песні. Землякі сабраліся групамі. Чуюцца смех, жарты.



На студэнцкай будоўлі.

А вось тут вырашаюць сур'ёзную праблему. Многія з хлопцаў упершыню ў будаўнічым атрадзе. Не маюць ніякай будаўнічай прафесіі. Вось і здараецца, што тыя ці іншыя работы застаюцца некранутымі. Не хапае навыкаў. Нехта кажа: «Добра было б, калі б атрады складаліся не з адных юрыстаў, фізікаў ці матэматыкаў, а яшчэ ўключалі б студэнтаў будаўнічых інстытутаў. Тады б не прыходзілася раз-пораз шукаць майстра, праpаба, каб прачытаць чарцёж ці параіцца. Дарэчы, чаму б не прыязджаць на будоўлю са сваім майстрам з ліку студэнтаў старэйшых курсаў будаўнічых інстытутаў? Гэта не толькі было б ім добрай практыкай, але мы мелі б і свайго зацікаўленага ў справе спецыяліста».

— Прыедзем дадому, абмяркуем гэтае пытанне больш грунтоўна, — разважаюць хлопцы.

— Ды кіньце вы спрачацца, — дакараюць іх дзяўчаты. — Хадзем песні слухаць. Сёння ж наша свята.

Каля сцэны ціха. Зачаравала, усхвалявала беларуская песня. Сорамна прызнацца, але хочацца дадому. Што ні кажыце, а цяжка пасля адвечна зялёнай Беларусі прывыкаць да голага стэпу, сухавею, пылу і спякоты. Уперадзе яшчэ цэлы месяц напружанай працы. Ці вытрымаем?

### ДЗЕНЬ АПОШНІ

— Ну, хлопцы, ідзе завяршальная! — крычыць са страхі Алег Яраш і махае рукамі, даючы знакі кранаўшчыку. Хутка ў праём апусціўся коўш з керамзітам, на якім ляжыць зроблены са шкловаты і рознакаляровых паперак вянок. Керамзіт па пакоях разнеслі імгненна. Апошнія насілкі даставілі амаль усім атрадам, і калі высыпалі, будынак ускалыхнула гучнае «ура». Вянок, дапоўнены рознымі ўпрыгожаннямі, урачыста павесілі каля ўваходу. Потым, нібы згаварыўшыся, пастроіліся ў калону і, спяваючы марш «Развітанне славянкі», рушылі ў лагер.

Вечарам было надзвычай ціха. Працоўныя турботы засталіся ў баку, а разам з імі нас пакінула нешта такое, з чым шкада было развітвацца.

Назаўтра рыхтаваліся да ад'езду. Хадзілі па горадзе. Зноў прыйшлі на магілу байцоў 25-й Чапаеўскай дывізіі, прыбраную нашым атрадам, потым развітваліся з усімі знаёмымі мясцінамі, углядаліся ў іх, каб запомніць назаўсёды.

Нас праводзілі рабочыя, з якімі мы пасябравалі на будоўлі, піянеры, якім вельмі спадабалася іх важатая Каця Свірыдэнка, жыхары-суседзі, мясцовая моладзь.

І вось зноў знаёма грукочуць колы: «Дадому, дадому». Пакрыквае цягнік: «Вязу, вязу-у!»

Але чаму ўсе сядзяць моўчкі, прытуліўшыся да цёмных вокан, і доўга глядзяць, як знікаюць удалечыні агні знаёмага горада?

Што адчувае гэты хлопец, прагна ўдыхаючы спрадвечны стэпавы пах кавылю і палыну?

Грукочуць колы: «Дадому, дадому...»

Не, мы не развітваемся з табой, Казахстан!

**Г. МАРОЗАЎ.**



Грукочуць колы: «Дадому, дадому». Але мы не развітваемся з табой, Казахстан! Фота М. ХАМЦА.

# ЭТЫКА ЎЗАЕМААДНОСІН

Кожны калектыў у нашай краіне жыве інтарэсамі ўсяго грамадства. Яскравы прыклад — шматтысячны універсітэцкі калектыў. У ім, як у здаровым і жывым грамадскім арганізме, у пастаянных зносінах знаходзяцца выкладчыкі і студэнты, калегі-вучоныя, рабочыя і служачыя, наведвальнікі і гаспадары. Можна сказаць, што універсітэт як своеасаблівы і спецыфічны калектыў — жывое ўвасабленне этыкі адносін людзей новага ладу жыцця — савецкага. Аднак давайце прыгледзімся адзін да аднаго: ці заўсёды мы ўважлівыя і культурныя, ветлівыя і карэктныя? Ці заўсёды мы прытрымліваемся нормаў камуністычнай маралі і савецкага этыкету? Пачнём з этыкі

### СЛУЖБОВЫХ АДНОСІН

Кожны з нас так ці інакш звязан з супрацоўнікамі універсітэта, вучэбна - дапаможным персаналам: увасабляе ў сваёй асобе супрацоўніка ці звяртаецца за даведкай, з просьбай да іншага. Самае першае патрабаванне — справу ставіць вышэй за ўсё, прытрымлівацца роўных. добразычлівых адносін, быць далікатнымі і ветлівымі адзін да аднаго. І калі хтосьці зрабіў тут промах, памылку, ён павінен чыстасардэчна браць віну на сябе, а не ўскладаць яе на таварышаў па службе, зрабіць усё магчымае, каб выправіць становішча, каб не панесла страты справа, не быў пакрыўджан наведвальнік. Кожны пастараецца належныя абавязкі выканаць сам, а не перакласці іх на іншага.

Характэрная рыса савецкага чалавека — пачуццё асабістай годнасці. Гэта заваёва нашага грамадскага ладу. У кожным прыстойным чалавеку трэба навучыцца бачыць дастойную павагі асобу. У нашым універсітэце мы, як правіла, сустракаемся менавіта з такімі людзьмі — вучонымі, ветэранамі вайны, цікавымі грамадзянамі.

Давайце ж будзем берагчы адзін аднаго, паважаць сваю і іншых годнасць, даражыць гонарам калектыву, які мы прадстаўляем, ганарыцца тым, што мы працуем з такімі цудоўнымі людзьмі! Помніце, што роля «прасіцеля», няхай нават па справядлівай справе, даволі далікатная, і пастарайцеся сябе паставіць на яго месца. Тады вы, напэўна, станеце больш ветлівымі, тактоўнымі. Вы паднімецеся для прывітання жанчыны, старэйшага па ўзросту і службовых адносінах, сустрэнеце ўвайшоўшага таварыша ветлівай усмешкай, прапануеце сесці і, калі заняты, папросіце вас прабачыць і крыху пачакаць. Вы, канешне, пастараецеся ўважліва выслухаць наведвальніка і дапамагчы яму, наколькі гэта ў вашых сілах. Бо мы існуем адзін дзеля аднаго. Напэўна, вы не станеце ўводзіць наведвальніка ў зман, даючы памылковую інфармацыю, даведку, прысвоіўшы сабе неўласцівыя функцыі, лёгкадумна пабяцаўшы тое, што нельга выканаць.

Вы калі-нікалі скардзіцеся, што вас не разумеюць. Уявіце сабе, выдатна разумеюць! А калі хтосьці сам сябе не разумее, ён павінен навучыцца шукаць прычыну ў сабе: не зайздросціць тым, хто чэсна дасягнуў вялікага поспеху па службе; не ліслівіць перад кіраўніком і не пагарджаць меркаваннем падначаленага; не пазіраваць, не рысавацца, не какетнічаць; не быць балбатлівым; не дабівацца спачування і жалю да сябе толькі таму, што сёння «падняўся не з той нагі»...

Выхаваны чалавек — у курсе важнейшых палітычных падзей, карыстаецца толькі дакладнай інфармацыяй з жыцця краіны, рэспублікі, калектыву, і таму ён — праціўнік плётак, неправераных слухаў, нагавораў ананімшчыкаў і зайздроснікаў, не церпіць двухсэнсоўных жартаў і дасціпнасцей. Ён працалюбівы, начытаны, інтэлігентны, ахайны і невычварны ў вопратцы. Ён — гаспадар свайго слова. Слова ў яго не разыходзіцца са справай.

...А цяпер уявіце такі малюнак. У кабінеце стаіць пажылы чалавек, нервова пераступае з нагі на нагу, стараецца хоць на хвіліну перахапіць погляд дзяўчыны, каб падаць дакумент. А яна, разваліўшыся ў вольнай позе, вось ужо дзесяць мінут дзеліцца па тэлефону «сакрэтам» з сяброўкай і час ад часу апаслива косіцца на няпрошанага госця... Вы не пазналі сваёй знаёмай?..

**С. ЛАПЦЁНАК,**
**дацэнт.**

---

семінарскія заняткі, калёквіумы і кансультацыі, напісанне дакладаў і рэфератаў, самастойная работа над падручнікам і вучэбнымі дапаможнікамі, манаграфіямі, часопіснымі артыкуламі і іншымі літаратурнымі крыніцамі, прагляд спецыяльных кінафільмаў і кінафрагментаў, дыяфільмаў і дыяпазітываў. Важна толькі добра выкарыстоўваць усё гэта. У разнастайным арсенале сродкаў, якія прымяняюцца для пазнання эканамічных законаў, асобае месца адводзіцца глыбокаму вывучэнню прадугледжаных вучэбнай праграмай твораў класікаў марксізму-ленінізму, дакументаў партыйных з'ездаў і Пленумаў ЦК КПСС і іншых матэрыялаў. Каб грунтоўна вывучыць палітэканомію, асабліва яе першую частку—«Капіталістычны спосаб вытворчасці», неабходна старанна праштудзіраваць такія класічныя творы, як «Капітал» К. Маркса і «Імперыялізм, як вышэйшая стадыя капіталізму» У. І. Леніна. Вывучэнне гэтых і іншых рэкамендаваных твораў класікаў марксізму-ленінізму дазваляе не толькі глыбока пазнаць эканамічныя законы развіцця грамадскай вытворчасці, якія дзейнічаюць пры капіталізме, але і асэнсаваць вялікую гістарычную місію пралетарыяту як магільшчыка буржуазіі.

Вывучаючы першую частку курса палітэканоміі, важна зразумець сутнасць і рэвалюцыйна-практычнае значэнне карэннага перавароту, які здзейсніў К. Маркс у палітэканоміі, усвядоміць эканамічныя законы, што кіруюць вытворчасцю, размеркаваннем, абменам і спажываннем матэрыяльных каштоўнасцей.

Незаменнай падмогай, акрамя канспектаў лекцый і першакрыніц, з'яўляюцца падручнік і вучэбная праграма. Яе абавязкова павінен мець кожны студэнт, які прыступіў да вывучэння палітэканоміі. Справа ў тым, што ў лекцыях і на семінарскіх занятках разглядаюцца толькі вузлавыя пытанні прадмета. А на экзамене студэнту могуць задаць любое пытанне, якое значыцца ў вучэбнай праграме.

З вучэбнай літаратуры рэкамендуецца падручнік «Палітычная эканомія» пад рэдакцыяй акадэміка АН СССР А. М. Румянцава (1973 год). Гэты падручнік выкладае заканамернасці і катэгорыі капіталістычнага спосабу вытворчасці, з разгляду якога, па сутнасці, пачынаецца вывучэнне палітэканоміі. Ён хоць і прызначан для эканамічных вну і факультэтаў, але ўпаўне можа быць выкарыстан студэнтамі ўсіх факультэтаў нашага універсітэта.

Для студэнтаў, якія працягваюць вывучэнне палітэканоміі, рэкамендуецца вучэбны дапаможнік «Палітычная эканомія сацыялізму» (выданне 2-е, перапрацаванае і дапоўненае. Выд. «Эканоміка», М., 1972) пад агульнай рэдакцыяй прафесара А. Ф. Румянцава.

Глыбокае, асэнсаванае засваенне асноўных палажэнняў палітэканоміі немагчыма без працавітасці, упартасці і ўмення самастойна працаваць. Той, хто пачынае вывучаць палітэканомію, павінен памятаць мудрую параду У. І. Леніна аб тым, што без пэўнай самастойнай працы ні ў адным сур'ёзным пытанні ісціны не знайсці, і хто баіцца працы, той сам сябе пазбаўляе магчымасці адшукаць ісціну.

Самастойная работа прадугледжвае канспектаванне прачытанага, асабліва першакрыніц. Канспектаваць патрэбна не ўсё прачытанае, а толькі асноўныя думкі, галоўныя палажэнні і вывады. Для гэтага трэба навучыцца адрозніваць галоўнае ад дапаможнага. Хто гэтага не ўмее рабіць, той, па трапнаму выразу М. Горкага, смажыць курыцу разам з пер'ем.

К канспектаванню патрэбна адносіцца сур'ёзна. Яно дысцыплінуе мысленне, прымушае ўдумацца ў прачытанае, павышае ўважлівасць, абуджае новыя самастойныя думкі, выхоўвае лагічнае мысленне, развівае памяць, садзейнічае добраму засваенню прачытанага. Канспекты павінны быць акуратнымі. У іх найбольш важныя думкі могуць быць выпісаны даслоўна або перададзены сваімі словамі. Канспекты трэба берагчы. Яны дапамогуць праз пэўны час успомніць і ўдакладніць раней набытыя веды.

Вядома, што асновай усякіх ведаў, першым этапам у любой разумовай рабоце з'яўляецца разуменне матэрыялу. Без яснага разумення эканамічных з'яў і сувязей, якія існуюць паміж імі, простае запамінанне, зазубрыванне —дарэмныя. Таму калі нешта незразумела, трэба абавязкова, не саромеючыся, звярнуцца да выкладчыка, пракансультавацца. Дапамагаюць таксама гутаркі, дыскусіі з таварышамі па вучэбнай групе, з тымі студэнтамі, якія ўжо вывучылі курс палітэканоміі.

У газетным артыкуле цяжка даць больш падрабязныя парады, тым больш, што яны могуць і павінны быць дыферэнцыраванымі ў адносінах да розных катэгорый студэнтаў. Таму ў заключэнне хацелася б падкрэсліць, што нават самыя лепшыя парады толькі тады прынясуць карысць, калі сам студэнт працуе сістэматычна, акуратна наведвае ўсе віды заняткаў, добрасумленна выконвае ўсе заданні, праяўляе настойлівасць у дасягненні пастаўленай мэты.

**П. БОРСУК,**
**дацэнт кафедры палітэканоміі гуманітарных факультэтаў.**



# НАША АГУЛЬНАЯ СПРАВА

У нашай краіне з кожным годам усё больш увагі ўдзяляецца пытанням аховы прыроды. У аснову ўсёй прыродаахоўніцкай справы пакладзены ленінскія ідэі і прынцыпы.

Камуністычная партыя і ўрад краіны прынялі шэраг важных пастаноў і законаў, накіраваных на рацыянальнае выкарыстанне прыродных рэсурсаў і ахову навакольнага асяроддзя. Патрабаванне аховы прыроды выражана ў Праграме КПСС, прадугледжана Дырэктывамі XXIV з'езда партыі. Усе савецкія рэспублікі прынялі Закон аб ахове прыроды. У Беларускай ССР гэты закон быў прыняты яшчэ ў 1961 годзе.

Вялікае значэнне мае далучэнне самай шырокай грамадскасці да работы па ахове прыроды. Толькі ў гэтым выпадку можна будзе выканаць намечаныя задачы, захаваць прыродныя рэсурсы, папярэдзіць знікненне відаў арганізмаў і разбурэнне помнікаў прыроды. Формы ўдзелу шырокай грамадскасці ў рабоце па ахове прыроды могуць быць вельмі разнастайнымі. Найбольш важнай з'яўляецца актыўная работа ў таварыствах аховы прыроды.

У нашай рэспубліцы з 1962 года дзейнічае Беларускае таварыства аховы прыроды. У гэтай добраахвотнай арганізацыі налічваецца звыш аднаго мільёна членаў. Асноўныя задачы таварыства: прапаганда ленінскіх ідэй і рашэнняў партыі і ўрада па пытаннях аховы прыроды, далучэнне працоўных да актыўнай работы па ахове прыроды, выхаванне пачуцця патрыятызму і любві да роднай прыроды, усемагчымае садзейнічанне дзяржаўным і грамадскім арганізацыям у правядзенні розных мерапрыемстваў па захаванню і рацыянальнаму выкарыстанню прыродных рэсурсаў.

Буйная пярвічная арганізацыя таварыства існуе і ў нашым універсітэце. Яна налічвае каля 5000 членаў. Ячэйкі таварыства ёсць на кожным факультэце. За шэраг год універсітэцкая арганізацыя зрабіла шмат карысных спраў. Штогод члены арганізацыі чытаюць сотні дакладаў і лекцый на прыродаахоўніцкія тэмы. Асабліва актыўна ўдзельнічаюць у прапагандысцкай рабоце выкладчыкі і студэнты геаграфічнага, біялагічнага і юрыдычнага факультэтаў. З дакладамі і лекцыямі актывісты неаднаразова выязджалі на заводы і фабрыкі г. Мінска, а таксама ў многія раёны рэспублікі. Лекцыйная прапаганда вядзецца праз таварыства «Веды», на старонках часопіса «Родная прырода», у рэспубліканскіх газетах, па радыё і тэлебачанню.

Два гады назад на біялагічным факультэце была створана дружына па ахове прыроды — «Зялёны патруль». Члены дружыны атрымалі правы грамадскіх інспектараў па ахове прыроды і актыўна ўзяліся за работу. На іх рахунку дзесяткі затрыманых браканьераў і парубшчыкаў лесу. Кожны такі выпадак — гэта захаванае дрэва ці жывёліна, якую забаронена адстрэльваць. У гэтых адносінах работу «Зялёнага патруля» цяжка пераацаніць. На жаль, патруль яшчэ не стаў агульнауніверсітэцкай арганізацыяй, у ім, дарэчы, не ўдзельнічаюць студэнты-юрысты, што было б вельмі пажадана.

Недастаткова актыўна пярвічныя арганізацыі прыцягваюць моладзь у члены таварыства. Калі на хімічным факультэце членствам ахоплены практычна ўсе студэнты і выкладчыкі (у гэтым вялікая заслуга асістэнта М. М. Бражнікава), а на біялагічным, юрыдычным, геаграфічным, матэматычным факультэтах гэты працэнт дастаткова высокі, то на фізічным, філалагічным і факультэце журналістыкі справы абстаяць далёка не блісkуча. А філолагі ж і журналісты могуць зрабіць асабліва многа ў справе прывіцця любві да роднай прыроды і выхаванні такім чынам савецкага патрыятызму.

Пакуль рэдкая з'ява — арганізацыя стэндаў, фотавыставак, выставак літаратуры, прысвечаных пытанням аховы прыроды.

Куткі аховы прыроды павінны быць на кожным факультэце, а іх змест адпавядаць профілю факультэта. Пры гэтым трэба зыходзіць з таго, што ахова прыроды і рацыянальнае выкарыстанне яе рэсурсаў з'яўляецца справай кожнага савецкага чалавека. Пакуль што стэнды і выстаўкі час ад часу наладжваюць толькі географы і біёлагі.

Непачаты край работы ў школах. Штогод нашы студэнты накіроўваюцца на педагагічную практыку. Справа гонару будучых педагогаў і навуковых супрацоўнікаў—стварыць юнацкія і дзіцячыя групы і весці ў іх работу па прапагандзе ведаў аб прыродзе і яе ахове, прыцягнуць школьнікаў да азелянення, аховы карысных птушак, насаджэнняў, збору насення каштоўных парод дрэў і г. д.

Унікальнае палажэнне універсітэцкай арганізацыі таварыства аховы прыроды, якая аб'ядноўвае спецыялістаў больш сотні профіляў, дазваляе весці і даследчыцкую работу. Такімі магчымасцямі не валодае ні адна другая вну рэспублікі, і іх патрэбна поўнасцю выкарыстоўваць для распрацоўкі асноў рацыянальнага выкарыстання прыродных рэсурсаў Беларусі. Адной з самых актуальных праблем у нас з'яўляецца зараз выкарыстанне сцёкавых вод для сельскагаспадарчых мэт. Да гэтай праблемы могуць быць прыцягнуты географы, эканамісты, хімікі і біёлагі універсітэта. Наспела пытанне арганізацыі наваднага універсітэта аховы прыроды для моладзі.

Справа гонару шматтысячнага універсітэцкага калектыву—зрабіць сапраўды важкі ўклад у ахову прыроды і рацыянальнае выкарыстанне яе рэсурсаў.

**І. ЛАПАЦІН, прафесар.**



Зіма напалохала... Фота Д. ЧАХОВІЧА.

# РАНІЦА НЕПАЧАТАГА ДНЯ

Яна была звычайнай школьніцай, пакуль не брала ў рукі пяро і фламасцер. Менавіта з іх узялі пачыналіся цуды... Яна малявала сэрцам. Так сказаў аб Надзі Рушавай Леў Касіль.

Ужо сам той факт, што к 17 гадам дзяўчына мела дзесяць тысяч малюнкаў, прызнаных цяпер ва ўсім свеце, здзіўляе.

Яна малявала сэрцам... І ніхто, наведаўшы выстаўку твораў на дзіва таленавітай маскоўскай школьніцы, не застаўся раўнадушным. Таму і сабралася столькі людзей на вечар, прысвечаны Надзі Рушавай, які на днях адбыўся ў актавай зале універсітэта. Тут прысутнічаў і бацька Надзі — М. К. Рушаў.

Яе малюнкі — тонкія, прыгожыя, глыбока псіхалагічныя. Гэта свабодная імправізацыя, ігра ўяўлення. Гэта яе бачанне свету. У восем гадоў Надзя стварыла сотню малюнкаў да «Подзвігаў Геракла», у дзевяць — столькі ж да «Адысеі», у дванаццаць — мноства да твораў рускіх класікаў.

І тое, з чым сустракаешся на выстаўцы твораў Надзі Рушавай, хвалюе менавіта таму, што гэта яе Пушкін, яе Блок, яе Наташа Растова і яе П'ер Бязухаў. Такімі стварыла іх Надзіна шчодрае ўяўленне.

Мастак В. А. Ватагін так ацэньваў работы Надзі Рушавай: «Яе малюнкі далёка выходзяць за рамкі «дзіцячай творчасці», але і сярод дарослых мастакоў многія наўрад ці змогуць паспрачацца з лёгкасцю яе тэхнікі, з адчуваннем кампазіцыі, з вастрынёй яе вобразаў — з яе творчым успрыняццем свету».

Жыццё Надзі Рушавай, кароткае, як успышка маланкі, як цудоўная раніца непачатага дня, пакінула такі светлы, хвалюючы след.

**Г. СТОМА,**

# «ДЗЕНЬ ІНФАРМАЦЫІ»

На працягу ўжо многіх год бібліятэкі вну вядуць інфармацыйна - бібліяграфічную работу, паведамляюць сваім чытачам аб літаратуры, што выйшла нядаўна. Інфармацыя робіцца на аснове паступленняў у бібліятэку і па даных бягучых бібліяграфічных выданняў Усесаюзнай кніжнай палаты, рэфератыўных часопісаў і зборнікаў ВІНІТІ, друкаваных картачак, а таксама галіновых і тэматычных выданняў іншых бібліятэк. Усе віды гэтага інфармацыйнага абслугоўвання выкарыстоўвае бібліятэка БДУ. Пытанне аб тым, як іх лепш арганізаваць, з'яўляецца адным з важнейшых у яе рабоце.

Раней аб паступленні новай літаратуры чытачы даведваліся з выставак, якія арганізоўваліся ў розных аддзелах бібліятэкі. Цяпер жа інфармацыя вядзецца ў поўным комплексе. З гэтай мэтай штотыднёва па чацвяргах праводзіцца «Дзень інфармацыі». На выстаўцы чытачы могуць азнаёміцца з усёй літаратурай, атрыманай бібліятэкай за тыдзень. Тут можна ўбачыць новыя кнігі па розных галінах навукі, часопісы на рускай, беларускай і замежных мовах, аўтарэфераты, інфармацыйна - бібліяграфічныя і іншыя выданні.

Выстаўка працуе ў студэнцкай чытальнай зале на другім паверсе з 12 да 19 гадзін. На зацікаўўшае выданне чытач можа аформіць заяву і атрымаць яго на наступны дзень у адпаведнай чытальнай зале. Вопыт паказвае, што выстаўкі «Дня інфармацыі» выклікаюць вялікую цікавасць і ў выкладчыкаў, і ў студэнтаў усіх факультэтаў. Аб гэтым сведчаць іх водгукі.

Поруч з арганізацыяй штотыднёвых «Дзён інфармацыі» бібліятэка ў далейшым будзе ўдасканальваць і іншыя формы інфармацыйнай работы.

**Р. ЛЯХОВІЧ, галоўны бібліятэкар.**

# ФОТАВЕРНІСАЖ



Калі я чую дзіцячы смех, я гавару: «Жыццё працягваецца».

Калі я думаю аб жыцці, я ўспамінаю знаёмых мне хлопчыкаў і дзяўчынак, якія пачынаюць рабіць першыя жыццёвыя крокі. Бо ў іх бачыш тую адкрытую непасрэднасць, якой часам не хапае нам. Вось першакласніца, упершыню пераступіўшая парог школы. Колькі дапытлівага, колькі таямнічага ў яе вачах і усмешцы! Хлопчык за рулём бацькоўскай машыны. Невядома, кім ён будзе, калі вырасце, але любоў да тэхнікі, якая зарадзілася ў дзяцінстве, ён пранясе праз усё жыццё. Саша смяецца, дзеці смяюцца — гэта галоўнае...

**М. ХАМЕЦ.**

● Першакласніца.

● І я буду шафёрам.

● Сашка.





# ПА СЛЯДАХ НАШЫХ ВЫСТУПЛЕННЯЎ

**У нашай газеце № 25 ад 27 верасня быў апублікаван артыкул старшага інструктара ДАІ УУС Мінгарвыканкома В. Ананьіна «Ахвяры неасцярожнасці», у якім прыводзіліся факты парушэння правіл бяспекі руху супрацоўнікамі факультэта прыкладной матэматыкі. Рэдакцыя накіравала публікацыю на факультэт для прыняцця мер. Як паведаміў старшыня прафбюро супрацоўнікаў факультэта прыкладной матэматыкі В. І. Карзюк, былі удакладнены прычыны і агульная карціна дарожных выпадкаў, якія здарыліся з тт. Ганчаровай і Радына. Высветлілася, што прычынай няшчасных здарэнняў з'явілася няўважлівасць і пешаходаў, і вадзіцеляў транспарту.**

**На факультэце цяпер праводзіцца растлумачальная работа з мэтай выкаранення парушэння правіл вулічнага руху супрацоўнікамі і студэнтамі. Прымяняецца наглядная агітацыя (распаўсюджанне брашур, плакатаў), вядуцца гутаркі ў студэнцкіх акадэмічных групах аб паводзінах пешахода на вуліцы. У бліжэйшы час плануецца правесці лекцыю-гутарку па правілах вулічнага руху з удзелам работнікаў ДАІ.**

**Рэдактар А. А. НІКОЛЕНКА.**

«Белорусский университет»—орган парткома, ректората, месткома, комитета комсомола и профкома Белорусского ордена Трудового Красного Знамени государственного университета им. В. И. Ленина. На белорусском языке.

Тыраж 2000 Аб'ём — 1 друк. ар.

Газета выходзіць па чацвяргах.

Наш адрас: г. Мінск, Універсітэцкі гарадок, геаграфічны корпус, п. 14. Тэлефон 22-07-19.

Ордэна Працоўнага Чырвонага Сцяга друкарня выдавецтва ЦК КП Беларусі. АТ 06967 Зак. 1199.